**Міхно, У.** Прайсці праз вайну / У. Міхно // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 2000. — 29 ліп. — С. 2.

## ПРАЙСЦІ ПРАЗ ВАЙНУ

Крэміс Сяргей Пятровіч... Зрэшты, яшчэ можна быць проста Сяргеем. Подыху старасці ён яшчэ пакуль не адчувае. Ёсць сіла, і не абыякая, каго хочаш з хлопцаў пабарукае. Яшчэ не кранула скроняў сівізна, і толькі маленькія зморшчынкі ля вачэй выдаюць гады.

Пра тое, што ён трапіў у Афганістан, Сяргей Крэміс даведаўся яшчэ ў Віцебску, у абласным ваенкамаце. Ад іх не ўтойвалі, і добра, бо калі ведаеш, што цябе чакае заўтра, лягчэй гэтае «заўтра» сустракаць. Вось каб яшчэ й ведаць, ці вернешся, але на гэта ўжо – божая воля... З маладосці не верыў Сяргей у Бога. Памятае нават, калі ўпершыню прыйшлі з пацанамі ў царкву ды адпусцілі там пару ласкавых пра ўсявышняга, разгневаныя бабулькі нават вытурылі іх з храма боскага. Але пажывеш – Кузьму бацькам назавеш. За 21 афганскі месяц, калі іхні славуты 345-ы полк літаральна не вылазіў з баёў, за тую доўгую і дзіўную вайну, праз якую прайшоў цэлым і жывым, не паверыць у Бога было немагчыма.

Напачатку была вучэбка, літоўскі горад Гайжунай, дзе рыхтавалі полк дпя адпраўкі ў Афганістан. Зрэшты, Сяргей яшчэ падлеткам сам сябе рыхтаваў у дэсантнікі: скончыў школу ДТСААФ, атрымаў трэці разрад па парашутнаму спорту. Падрыхтоўка і загартоўка, вядома ж, спатрэбіліся там, на вайне.

Гэта нам здаецца, што яны павінны быць каменнымі, загартаваўшыся ў баях, нанюхаўшыся пораху. А яны – жывыя людзі. І таму ў Сяргея, у здаровага, вясёлага і таварыскага мужыка, каму нішто чалавечае не чужое: трэба – і кампанію падтрымае, трэба – і чарку вып’е, раптам на вачах паяўляюцца слёзы. Ёсць што ўспомніць – ды вось успамінаць не надта хочацца... Баліць, баліць душа. За хлопцаў, якіх пакінулі там, навекі, маладых, вясёлых. Ім бы жыць ды жыць. За сяброў, якія часта не могуць знайсці сябе ў гэтым мірным жыцці. Сёння таксама жывем, як на вайне, сёння – выжывае мацнейшы. А яны, афганцы, з параненымі душамі. У іх вельмі абвостранае пачуццё рэальнасці. Вось і адыходзяць з жыцця, заўчасна, пасля вайны ўжо, па сваёй волі. Нядаўна ў Чашніках пахавалі афганца...

Недзе ёсць на свеце яго баявыя сябры: Алег Шкурупій – у Томску, Генка Заберскі – у Маскве, Саня Завадскі – у Оршы. На вайне зусім іншая дружба, чымся ў мірны час. Там хлопцы са скуры лезуць, свае галовы падстаўляюць, цябе ратуючы. Але не ўсе. Было і па-іншаму. Нават непамысна, але на вайне знайшлося месца і дзедаўшчыне.

І некаторыя загінулі зусім не доблесна, у баях, а ... ад рук сваіх жа таварышаў па службе, з якіх здзекваліся. Многа было бруду на вайне.

Помніць Сяргей, як сустрэў ужо ў Саюзе аднаго тыпа, што прыкінуўся быў у Афгане глухім, а «адкасіўшы» ад вайны, раптам «выздаравеў». Ох, і зачасаліся рукі... Чаму ён павінен тут з дзеўкамі забаўляцца, у той час, як сябры засталіся там есці хлеб, што да сцяны прыклейваецца, кансервы... І – паміраць.

Плюньце таму ў вочы, хто кажа, што не страшна ў баі. Першы бой, калі помніш толькі, як за спіною кулі пясок прашываюць, а ты бяжыш і молішся Богу... Помніш толькі страх – вось яна,

вайна. Першы забіты «дух», якога ты забіваў холадна і мэтанакіравана, узяўшы вінтоўку ў снайпера, забіваў, бо трэба было ж пачынаць забіваць... Вось яна – вайна...

Першы медаль – «За адвагу», за дзесяць кулямётных кропак, якія знялі, за той кулямёт, што стаяў на вышыні, на пагорку. Ішлі да яго лагчынаю па тэрыторыі, на якой усе яны маглі запраста стаць мішэнямі... Але ішлі, бо трэба было ліквідаваць тое гняздо. «Духаў» ля кулямёта не было, пакінулі, а калі б былі, то іх, хлопцаў, ужо б не было нікога.

Але яны ёсць. І ён, Сяргей, жыве, ходзіць па гэтай зямлі, мае жонку, гадуе двух дачок. Ён застаўся жыць, бо на ўсё воля божая. Працаваў, вярнуўшыся, слесарам у агразабеспячэнні, а зараз на міжрайбазе, на пагрузчыку. У вольны час любіць пасталярыць. Рукі залатыя.

Дэсантнік змяніў БТР на кару (машына такая мірная), але не здрадзіў сваёй памяці. Прыйдзе 2 жніўня, і яны зноўку, як заўсёды, накіруюцца да рэчкі, усе, хто быў у дэсанце, не важна, дзе служылі, бо быць дэсантнікам – не прафесія, гэта стан душы.

Вып’юць – за былое і сённяшняе, за сяброў баявых і за сваю вогненную маладосць.

Святкуйце, хлопцы. Прыйшло свята і на вашу вуліцу. Вы яго заслужылі...

**У. Міхно**